## *А тым часам...*

***Днямі стала вядома, што мастацкая галерэя "Універсітэт культуры" атрымала грант спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі на ажыццяўленне праекта "Правядзенне маштабнай выставы творчых дасягненняў навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў Беларусі і выданне каталога мастацкіх твораў маладых аўтараў". Дырэктар галерэі і куратар праекта Павел САПОЦЬКА расказаў нашаму карэспандэнту пра сутнасць і мэты гэтага праекта.***

— Наша галерэя працуе ў розных кірунках, — патлумачыў Павел Сапоцька, — але прыярытэтам для нас з'яўляюцца менавіта падтрымка таленавітай моладзі, стварэнне ўмоў для раскрыцця яе творчага патэнцыялу. У гэтым плане мы праводзім розныя мерапрыемствы. Напрыклад, ужо традыцыйнымі сталі нашы выставы ў межах Міжнароднага тыдня мастацкай адукацыі ЮНЕСКА, выставы па выніках рэспубліканскіх конкурсаў, а таксама персанальныя выставы студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў. Хацеў бы падкрэсліць, што гэта заўсёды вельмі цікавыя праекты, якія вельмі прыемна ажыццяўляць.



Ладзілі выставы твораў і навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў, у прыватнасці, два гады назад у нашай галерэі праходзіла комплексная выстава твораў навучэнцаў чатырох мінскіх школ. Але каб ахапіць у адной экспазіцыі ўсе ДШМ Беларусі (а яны ёсць у кожным раёне нашай краіны) — такога, безумоўна, яшчэ ніколі не было. І ўвогуле, трэба адзначыць, што для правядзення буйных выстаў дзіцячых твораў у нас усё-такі малавата пляцовак. Натуральна, наш Нацыянальны мастацкі музей гэтым не будзе займацца, іншыя буйныя музеі кшталту Нацыянальнага гістарычнага — таксама. Вельмі вялікую работу ў гэтым сэнсе робіць Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, але яго выставачная пляцоўка ўсё-такі больш камерная, разлічаная на наведванне яе найперш самімі дзецьмі і іх настаўнікамі, а не шырокай грамадскасцю.

Вось мы і вырашылі зрабіць маштабную выставу творчых дасягненняў навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў Беларусі, каб максімальна і сістэмна ахапіць гэты сектар дзіцячай мастацкай адукацыі. Гэты праект ажыццяўляецца пры падтрымцы Міністэрства культуры і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. На падрыхтоўку нам адведзена некалькі месяцаў, выстава пройдзе ў чацвёрты тыдзень мая — якраз на працягу Міжнароднага тыдня мастацкай адукацыі ЮНЕСКА.

Хацеў бы падкрэсліць, што гэта не конкурс, а своеасаблівая выбарка лепшых твораў навучэнцаў, якую будуць праводзіць на пасяджэннях журы і аргкамітэта прафесійныя эксперты: куратары выстаў, выкладчыкі, мастацтвазнаўцы, сябры творчых саюзаў. Яны будуць карыстацца рознымі крытэрыямі. Гэта і тэхніка выканання, і, як кажуць, ідэйны змест, і эстэтычны складнік. Але канчатковымі задачамі мы ставім самаактуалізацыю, самаразвіццё і самарэалізацыю юнай і маладой творчай асобы. І, канечне, папулярызацыю дзіцячай творчасці. Усё-такі мы знаходзімся ў цэнтры Мінска. Штодня нашу галерэю наведвае шмат людзей: мінчане, госці сталіцы і госці краіны. І нам будзе вельмі прыемна, калі яны ўбачаць надзвычай шчырыя, цёплыя і, я сказаў бы нават, харызматычныя творы нашых навучэнцаў.

Яшчэ адзін важны складнік праекта — стварэнне каталога лепшых дзіцячых і юнацкіх твораў. Не сумняваюся, што зробім якасны прадукт — каб тое лепшае, што ствараюць у мастацкай творчасці нашы дзеці і падлеткі, захавалася ў гісторыі.

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*
**Фота аўтара.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ